# Практыкаванні для адпрацоўкі навыку правапісу вялікай літары

**1.** Якія імёны дзяўчынак «схаваліся» ў слове ***Паліна***? Запішыце іх у алфавітным парадку. *(Аліна, Іна, Ліна, Паліна.)*

**2.** Колькі імён хлопчыкаў і дзяўчынак схавалася ў слове ***Яніна***? Запішыце імёны ў алфавітным парадку. *(Імёны хлопчыкаў: Ян. Імёны дзяўчынак: Іна, Ніна, Яніна. Іна, Ніна, Ян, Яніна.)*

**3.** Прачытайце словы. Запішыце імёны, якія «схаваліся» ў словах?

*Зеляніна, антонаўка, бяроза, таполя, яліна, тканіна.*

У якіх словах «схавалася» некалькі імён?

**4.** Запішы імёны, якімі можна назваць як хлопчыкаў, так і дзяўчынак.

Напрыклад: Саша.

*(Жэня, Слава, Вася.)*

**5.** Разгадайце рэбусы. Запішыце словы. Растлумачце іх правапіс.

$\frac{\textbf{ця}}{\textbf{с}}$ $\frac{\textbf{р}}{\textbf{за}}$

*(Насця, Назар)*

**6.** Прачытайце. Адкажыце на пытанне, якое змешчана ў вершы.

Дзе Оля?
Алеся — у лесе,
Люся — у лузе,
Поля — у полі,
Каця — у хаце,
Надзя — у садзе,
Там — і Ядзя.
А дзе Оля,
Калі Поля
Разам з Оляй?

*А. Зэкаў.*

Запішыце імёны дзяўчынак у алфавітным парадку. Падкрэсліце вялікую літару.

**7.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.

Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.

Ліда і Люба
Ліда ў Любані жыве.
Люба ажно ў Лідзе.
Піша Ліда Любе.
Піша Люба Лідзе.

*Н. Сторажава.*

Выпішыце назвы гарадоў і імёны дзяўчынак.

**8.** Прачытайце верш. Палічыце, колькі ўсяго дзяўчынак.

Наш дом
Жывуць у доме нашым
Дзве Тамары, дзве Наташы,
Тры Алінкі і Галінка,
Таня, Надзя і Марынка,
Люда, Оля, Іра, Саша —
І зусім няма Янінак...
Колькі ў доме нашым
Усяго дзяўчынак?

*А. Зэкаў.*

Выпішыце імёны дзяўчынак у алфавітным парадку. Падкрэсліце вялікую літару.

**9.** Прачытайце лічылку. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах. Запішыце імёны ў алфавітным парадку.

Сядзелі на ганку
Іра, Даша, Янка,
Люда, Дзіма, Коля,
Надзя, Зіна, Оля,
Косця, Пеця, Саша,
Толя, Юра, Маша,
Галя, Вера, Клім...
Ты ідзеш за ім?

*А. Зэкаў.*

**10.** Прачытайце верш. Хто еў ірыскі? Колькі дзяцей было ўсяго? Выпішыце імёны дзяцей. Падкрэсліце вялікую літару.

Каля горкі
Два Рыгоркі,
Дзве Марынкі,
Дзве Ірынкі,
Два Барыскі,
Дзве Ларыскі
Елі смачныя ірыскі.

*А. Дзеружынскі.*

**11.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.

Сеня сена косіць,
Сева сена носіць...
Носіць сена Сева,
Косіць сена Сеня.

*У. Мацвеенка.*

Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца адным гукам. Запішыце гэтыя словы. Якія словы трэба запісаць з вялікай літары? Чаму?

**12.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Запішыце словы-адгадкі. Растлумачце іх правапіс.

З ***л*** — імя дзяўчыны
І рака таксама.
З ***в*** — сталіцай слыннай
У Еўропе стану. *(Лена — Вена.)*

*М. Пазнякоў.*

Сталіца роднай Беларусі,
Але адразу назавуся
Палескім горадам табе,
Калі заменіш ***М*** на ***П***. *(Мінск — Пінск.)*

*У. Мазго.*

**13.** Прачытайце. Выпішыце з верша назвы гарадоў. Падкрэсліце вялікую літару.

Лепшы ў свеце для Барыса
Горад з назваю Барысаў.
Вельмі любяць, уявіце,
Ліду — Ліда, Віцебск — Віця,
Слава — Слаўгарад.
А Люба для сябе адкрыла Любань.

*У. Мазго.*

**14.** Прачытайце лічылкі. Якую добрую справу зрабілі дзеці? Чаму неабходна [illegible]

Пасадзілі сад
Коля, Галя, Клім, Рыгорка,
Валя, Міша і Ягорка
Ад аўторка да аўторка
Шчыравалі ля пагорка:
Пасадзілі дзеці сад —
Кожны добрай справе рад.
*М. Пазнякоў.*

Хто будзе памагаць?
Міша, Вова, Галя, Надзя
Грады ўскопваюць у садзе.
Садзяць дрэўцы і кусты,
Памагаць ім
Будзеш ты!
*М. Пазнякоў.*

Спішыце другую лічылку. Падкрэсліце вялікую літару ў імёнах дзяцей.

**15.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце словы-адгадкі. Растлумачце напісанне вялікай літары ў адной з адгадак.

Яна сакрэт цікавы мае,
Чым возьмеш больш —
Тым большай стане.
А ў назве перастаў склады —
Імя жаночае тады. *(яма — Мая.)*
*У. Мацвеенка.*

**16.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце словы-адгадкі. Якое слова-адгадку неабходна напісаць з вялікай літары. Чаму?

Ён любіць горы, стромы і цясніны.
З іх без развагі рушыць у палёт,
Але ўвага: вось імя дзяўчыны,
Толькі прачытай наадварот. *(арол — Лора.)*
*У. Мацвеенка.*

**17.** Прачытайце верш. Пра каго ў ім расказваецца? Што дае людзям карова?

Карова
— Ты куды ідзеш, **(Р/р)агуля**?
— На мурожны луг іду я,
Траўкі ўволю наскубуся,
Дасць вады рака,
А пад вечар я вярнуся,
Прынясу вам малака.
*М. Пазнякоў.*

Спішыце першы сказ. Растлумачце, з якой літары трэба напісаць выдзеленае слова.

**18.** Прачытайце. Растлумачце, з якой літары трэба напісаць выдзеленае слова. Спішыце.

Спіць даўно ***(Д/д)ружок***
У будцы пад акном,
І паснулі ў норцы
Мышкі моцным сном.
*М. Пазнякоў.*

Калі слова ***дружок*** трэба напісаць з маленькай літары? Прывядзіце прыклад.

**19.** Прачытайце. Ці здагадаліся вы, хто з'еў мандарыны?

Растлумачце правапіс вялікай літары ў выдзеленых словах.

Дзе мандарыны?
— Не хапае мандарынаў, —
Кажа вечарам **Дарына**. —
І куды раптоўна зніклі?
Апусціла вочы **Шурка**:
— Іх, напэўна, з'ела **Мурка**.
*М. Пазнякоў.*

Дапоўніце сказы словамі з верша:
*Дзяўчынкі* ________, ________.
*Кошка* _______.

**20.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся правільна іх вымаўляць.

Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

У (С/с)оні і (С/са)ні (С/с)анкі беглі (С/с)амі.
Укусіла (А/а)са (А/а)сю.
*А. Клышка.*

Запішыце па памяці першую скорагаворку.

**21.** Дапоўніце сказы клічкамі жывёл. Запішыце.

Мышэй ловіць кот _______.
Хату сцеражэ сабака_______.
У хляве мычыць карова ________.
У майго дзядулі прыгожы конь _________.

**22.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Міла і мыла
Гаварыла (М/м)іла (М/м)іла,
Што пра мыла — не забыла.
Ды свайго сабачку (М/м)ілу
Мыла (М/м)іла ўсё ж без мыла.
*К. Жук.*

Спішыце. Устаўце патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

**23.** Прачытайце каламбур. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы. Спішыце.

Працавітая Марынка
Гаварыў дзед (П/по)лі,
Што Марынка ў (П/п)олі.
Разам з маці (П/п)оле
Калгаснае (П/п)оле.
*У. Мацвеенка.*

Што робіць Марынка? Раскажыце, як вы дапамагаеце бацькам.

**24.** Прачытайце. Пры спісванні ўстаўце ў словы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

Быў у цырку ўчора (Л/л)еў,
Спадабаўся хлопцу
На арэне (Л/л)еў.
Для сястрычкі (П/п)олі
Васількоў букецік
Я нарваў ў (П/п)олі.
Малайчына (С/с)лава —
Вучыцца выдатна,
Будзе ў яго (С/с)лава.
Вова — з (М/м)агілёва,
А суседка (Р/р)ыма
Прыляцела з (Р/р)ыма.
Любіць спорт (Н/н)адзея,
Чэмпіёнкай стаць —
У яе (Н/н)адзея.
*М. Пазнякоў.*

**25.** Прачытайце. Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

— Добры дзень! —
Сказала (М/м)іла
І ўсміхнулася нам (М/м)іла.

**26.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка яе вымаўляць.

Згатавала Саша кашу для Машы.
Маша Сашы ўдзячная, каша ў Сашы смачная.

*М. Пазнякоў.*

Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах. Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Запішыце гэтыя словы.

**27.** Прачытайце сказы. Растлумачце, з якой літары трэба напісаць выдзеленыя словы. Спішыце.

1) Мне падарылі новы ***(Т/т)анк***. Максім ***(Т/т)анк*** — беларускі паэт.

2) На зімовых канікулах мы паедзем у ***(Г/г)оркі*** да бабулі. Прыемна зімой з'ехаць з ***(Г/г)оркі***.

3) У мяне заставалася ***(Н/н)адзея*** на дапамогу сяброў. Нашу настаўніцу завуць ***(Н/н)адзея*** Мікалаеўна.

4) Матуля ***(К/к)упала*** браціка. Янка ***(К/к)упала*** — выдатны паэт Беларусі.

**28.** Прачытайце. Пры спісванні дапоўніце сказы імёнамі і імёнамі па бацьку.

Наша сям'я

У нас дружная сям'я. Маці завуць____ ____, бацьку — ____ ____. Ёсць у мяне сястра _____ і брат _____. Мяне завуць ______. Наша прозвішча — ______.

**29.** Прачытайце тэкст. Растлумачце напісанне вялікай літары ў выдзеленых словах.

На беразе ***Заходняй Дзвіны*** стаіць старажытны ***Полацк***. Непадалёку ад яго вырас прыгожы горад хімікаў ***Наваполацк***.

На захадзе наша рэспубліка мяжуе з ***Польшчай***. Недалёка ад граніцы расце і прыгажэе ***Гродна***. На поўдзень ад ***Гродна*** стаіць прыгожы і зялёны ***Брэст***.

На высокіх берагах ***Сожа*** ўзвышаюцца заводы і фабрыкі ***Гомеля***. Пасля ***Мінска Гомель*** самы буйны горад рэспублікі.

На ўзбярэжжы ***Дняпра*** раскінуўся горад ***Магілёў***.

Выпішыце назвы беларускіх гарадоў у алфавітным парадку.

**30.** Разгадайце рэбусы. Дапоўніце сказ словамі, якія ў вас атрымаліся. Растлумачце іх правапіс.




*(Брэст)*




*(Гомель)*




*(Магілёў)*

_____, _____, ______ — гарады Беларусі.

**31.** Прачытайце тэкст. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

Наша Беларусь

У (Б/б)еларусі многа прыгожых гарадоў. Вялікі прыгожы горад (М/м)інск. Вырас цудоўны горад (С/с)алігорск. Стаў прыгожым (П/п)олацк. На беразе (Д/д)няпра раскінуўся горад (М/м)агілёў.

Выпішыце назвы беларускіх гарадоў.

**32.** Прачытаце тэкст. Пры спісванні ўстаўце ў словы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

Мінск

Горад (М/м)інск — сталіца (Б/б)еларусі. Галоўная вуліца горада — праспект (Н/н)езалежнасці. У (М/м)інску працякае рака (С/с)віслач. Наша школа знаходзіцца на вуліцы (К/к)рапоткіна.

**33.** Разгадайце рэбусы. Запішыце словы. Растлумачце іх правапіс.

1) Самае вялікае па плошчы возера Беларусі. *(Нарач.)*




2) Самая вялікая рака Беларусі. *(Днепр.)*




3) Самы старажытны горад Беларусі. *(Полацк.)*




**34.** Складзіце ланцужок слоў. Кожнае наступнае слова павінна пачынацца з апошняй літары папярэдняга.

Назва горада — імя дзяўчынкі — імя хлопчыка — назва возера:

*М......к — К.......а — А.......н — Н........ч*

*(Мінск — Кацярына — Антон — Нарач.)*

Чаму словы неабходна запісаць з вялікай літары?

***Н. М. Антановіч,*** *выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*